Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “ЛІЧЭБНІК. РАЗРАДЫ ЛІЧЭБНІКАЎ”

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01 Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск
2019

**ЗМЕСТ**

**1. Тэарэтычны раздзел**

1.1. Лічэбнік як часціна мовы

1.2. Разрады лічэбнікаў паводле агульнага граматычнага значэння

1.3 Разрады лічэбнікаў паводле структуры

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычныя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1. Тэарэтычны раздзел

### 1.1. Лічэбнік як часціна мовы

***Лічэбнік*** – самастойная часціна мовы, якая абазначае абстрактныя лікі, колькасць, сукупнасць ці парадак прадметаў пры лічэнні: *чатыры, трыццаць, дваццаць два гады, цацвёра дзяцей, трэці час.*

Са значэннем абстрактнага ліку лічэбнікі выступаюць тады, калі ўжываюцца без назоўнікаў. Такія лічэбнікі выкарыстоўваюцца, як правіла, у матэматыцы і маюць адпаведныя лічбавыя абазначэнні: *сем плюс тры* = *дзесяць.*

Колькасць прадметаў ці парадак іх пры лічэнні абазначаюць лічэбнікі ў спалучэнні з назоўнікамі і асабовымі займеннікамі: *пасадзілі два дубкі; нас трое.*

Лічэбнік як самастойная часціна мовы мае пэўныя марфалагічныя прыметы. Усе лічэбнікі, акрамя *дзевяноста, паўтара, паўтары*, скланяюцца. Колькасны лічэбнік *адзін* і ўсе парадкавыя змяняюцца па родах і ліках. Лічэбнікі *два, дзве, абодва, абедзве, паўтара, паўтары* змяняюцца па родах. Маюць род і словы *тысяча* (жаночы), *мільён, мільярд* (мужчынскі). Пераважная большасць колькасных лічэбнікаў, за выключэннем *адзін, тысяча, мільён, мільярд*, не мае граматычных катэгорый роду і ліку.

У сказе лічэбнік (найчасцей з назоўнікам) можа быць дзейнікам: *Дзве бярозы шумяць пад акном* (Астр.); выказнікам: *Плошча Нарачы – восемдзясят квадратных метраў* (Б.); азначэннем: *Настала чацвёртая ноч* (К-с); дапаўненнем: *Сямёра аднаго не чакаюць* (Прык.); акалічнасцю: *Гэтая вялізнае гняздо я ведаў гадоў пяць* (Р.І.).

### 1.2. Разрады лічэбнікаў паводле агульнага граматычнага значэння

Паводле значэння і граматычных асаблівасцей лічэбнікі падзяляюцца на колькасныя і парадкавыя. ***Колькасныя*** лічэбнікі абазначаюць адцягненыя лікі або колькасць аднародных прадметаў: *два, сорак, сто метраў.*

Колькасныя лічэбнікі падзяляюцца на пэўнаколькасныя (*чатыры, семсот*), зборныя (*трое, шасцёра*) і дробавыя (*адна другая, восем цэлых і шэсць дзясятых*).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Пэўнакалькасныя*** лічэбнікі ўказваюць на колькасць аднародных прадметаў або абазначаюць абстрактныя лікі: *Ад шасцідзесяці двух адняць сорак – будзе дваццаць два.*

Пэўнакалькасныя лічэбнікі адрозніваюцца ад іншых разрадаў граматычнымі асаблівасцямі. Большасць з іх не змяняюцца па родах і ліках, апрача лічэбнікаў *адзін, два, тысяча, мільён, мільярд*. Лічэбнік *адзін* мае формы ўсіх трох родаў ў залежнасці ад роду назоўніка, з якім спалучаецца: *адзін год, адна зіма, адно лета*. Яму ўласцівы формы адзіночнага і множнага ліку: *адзін стол, адны акуляры*. Лічэбнік *адны* ў форме множнага ліку ўжываецца толькі пры множналікавых назоўніках: *адны вароты, адны нажніцы.*

Лічэбнік *два* спалучаецца з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду, *дзве* – з назоўнікамі жаночага роду: *два сыны, дзве дачкі*.

Лічэбнік *тысяча* мае форму жаночага роду, *мільён, мільярд* – мужчынскага. Яны маюць катэгорыю ліку: *тысяча – тысячы*, *мільён – мільёны, мільярд – мільярды*; пры іх могуць быць азначэнні*: кожная тысяча кіламетраў.*

***Няпэўнакалькасныя*** лічэбнікі, як паказвае сам тэрмін, абазначаюць няпэўную колькасць аднародных прадметаў. Да іх адносяцца словы *многа, мала, шмат* і інш.

***Дробавыя*** лічэбнікі абазначаюць частку адзінкі або цэлы лік і частку адзінкі: *дзве трэція, пяць цэлых і шэсць дзясятых*.

Асаблівасцю дробавых лічэбнікаў з'яўляецца іх здольнасць спалучацца з рэчыўнымі і зборнымі назоўнікамі: *тры пятыя насельніцтва; адна восьмая даходаў.*

Паводле структуры дробавыя лічэбнікі састаўныя. Яны ўтвараюцца з пэўнакалькаснага лічэбніка ў лічніку і парадкавага лічэбніка ў назоўніку.

Калі лічэбнікі выражаюць цэлы лік і частку цэлага, то пасля назвы цэлага ліку ўжываецца злучнік *і* або прыметнік *цэлы*, а потым дробавы лічэбнік: *тры і пяць дзясятых* або *тры цэлыя і пяць дзясятых*. Пры абазначэнні дзесятковых дробаў выкарыстоўваецца спалучэнне *нуль цэлых*: *нуль цэлых і тры дзясятыя*.

Сярод дробавых лічэбнікаў выдзяляюцца словы *паўтара, паўтары*, якія абазначаюць колькасць, што складаецца з цэлага і яго палавіны. Лічэбнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*паўтара* ўжываецца пры назоўніках мужчынскага і ніякага роду, *паўтары* – пры назоўніках жаночага роду: *паўтара года, паўтары гадзіны*.

***Зборныя*** лічэбнікі абазначаюць пэўную колькасць прадметаў як адно цэлае: *двое, абодва, абедзве, абое, трое, чацвёра, пяцёра, шасцёра, сямёра, васьмёра, дзявяцера, дзясяцера.*

Утвараюцца зборныя лічэбнікі ад асновы пэўнаколькасных лічэбнікаў з дапамогай суфіксаў *-ој-э, -ёр-а, -ер-а*: *тры – трое, чатыры – чацвёра, дзесяць – дзясяцера*.

***Парадкавыя*** лічэбнікі абазначаюць парадак прадметаў пры лічэнні: *пяты паверх, трыццаць шосты год*.

**1.3. Разрады лічэбнікаў паводле структуры**

Паводле структуры лічэбнікі падзяляюцца на простыя, складаныя і састаўныя. ***Простыя*** лічэбнікі маюць адзін корань: *два, сорак, мільён*. ***Складаныя*** лічэбнікі ўтвараюцца з двух і болей каранёў: *пяцьдзесят, семсот*. ***Састаўныя*** лічэбнікі складаюцца з двух або больш слоў: *семдзесят восем, сто сорак першы.*

## 2. Пытанні да самакантролю ведаў

*1. Ахарактарызуйце лічэбнік як часціну мовы.*

*2. У якіх выпадках лічэбнік абазначае абстрактны лік?*

*3. Назавіце ўмовы, пры якіх лічэбнік абазначае колькасць прадметаў ці парадак пры лічэнні.*

*4. На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі паводле агульнага граматычнага значэння?*

*5. Што абазначаюць пэўнаколькасныя лічэбнікі?*

*6. Якое значэнне маюць няпэўнаколькаcныя лічэбнікі?*

*7. Пры якіх умовах словы* мала, многа, некалькі, шмат *з'яўляюцца няпэўнаколькаснымі лічэбнікамі, а пры якіх – прыслоўямі?*

*8. Што абазначаюць дробавыя лічэбнікі?*

*9. З якімі назоўнікамі могуць спалучацца дробавыя лічэбнікі?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*10. Якое значэнне маюць зборныя лічэбнікі?*

*11. Ахарактарызуйце спосаб утварэння зборных лічэбнікаў.*

*12. Што абазначаюць парадкавыя лічэбнікі?*

*13. Назавіце разрады лічэбнікаў паводле структуры.*

## 3. Практычныя заданні

**Заданне 1. Прачытайце тэкст. Запішыце лічэбнікі словамі, вызначце іх разрад паводле структуры і значэння.**

У спіс 7 цудаў свету ўключана і статуя Калоса Радоскага. Гэта бронзавая фігура, вышыня якой дасягае 37 метраў, узвышалася над гаванню вострава Радос, плошча якога роўная 1404 кіламетрам. Скульптар Харэт вырашыў складаныя тэхнічныя праблемы стварэння каменна-металічнай махіны, і ў 282 годзе да н.э. статуя была ўстаноўлена на вызначанае месца. Але да 227 года да н.э. Радос прыйшоў ужо без знакамітага стварэння, таму што яно было разбурана землятрусам. Нізрынуты бог праляжаў да сярэдзіны УІІ стагоддзя н.э., пакуль арабы не разнялі яго на часткі і не вывезлі на 900 вярблюдах.

(“Родны край”)

**Заданне 2. Адкажыце пісьмова на пытанні, ужываючы лічэбнікі.**

- Да якога году адносіцца першае летапіснае ўпамінанне пра горад Мінск?

- З колькіх абласцей складаецца тэрыторыя Рэспублікі Беларусь?

- З якога ўзросту можна атрымаць правы на кіраванне аўтатранспартам?

- Колькі беларускіх населеных пунктаў было знішчана ў гады Вялікай Айчыннай вайны?

- У колькі гадзін пачынае працу мінскае метро?

- У колькі гадзін пачынаецца Новы год?

- У якім годзе выйшаў адзіны прыжыццёвы зборнік М.Багдановіча?

- У якім годзе зроблены майстрам-ювелірам Лазарам Богшам крыж Ефрасінні Полацкай?

- Чаму роўны лік *П* (пі)?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Якая прыблізная колькасць азёраў на тэрыторыі Беларусі?

**Заданне 3. Перакладзіце тэкст з рускай мовы на беларускую. Вызначце граматычныя асаблівасці лічэбнікаў.**

На территории Березинского заповедника обитают 203 вида птиц, в том числе 165 – гнездящихся, 20 – пролетных, 12 – залетных, 6 – прилетающих на зиму. Среди гнездящихся – 132 вида перелетных и 33 оседлых. В их числе 2 вида гагар, 4 – поганок, 6 – аистообразных, 17 – гусеобразных, 18 – дневных хищных, 6 – куриных, 7 – журавлеобразных, 25 – ржанкообразных, 5 – голубей, 1 – кукушкообразных, 9 – сов, 1 – козодоеобразных, 1 – стрижей, 3 – ракшеобразных, 9 – дятлов, 89 видов воробьиных птиц.

Заповедник населяют преимущественно лесные (82 вида) и водно-болотные птицы (59 видов), гораздо меньше птиц открытых пространств (10 видов) и населенных пунктов (14 видов).

(“Заповедники Прибалтики и Белоруссии”)

**Заданне 4. Вызначце, да якой часціны мовы адносяцца выдзеленыя словы.**

1. *Шмат* дзіва, але *мала* мліва. 2. Не *столькі* таго мёду, *колькі* смуроду. 3. Лепей *мала*, чым нічога. 4. Хто *зашмат* жадае, той нічога не мае. 5. Апошняму ці *многа*, ці нічога. 6. *Колькі* робіш, *столькі* вучыся. 7. У бога дзён *многа* – паробім. 8. *Шмат* вады сплыве, пакуль чалавек таго дажыве. 9. *Шмат* у гарнец такіх малайцоў улезе. 10. Дзе прыгляднікаў *многа*, там поспеху *мала*. 11. *Многа* чуецца, ды *мала* верыцца.

**Заданне 5. Вызначце, якімі часцінамі мовы з’яўляюцца аднакаранёвыя словы.**

Чацвёрты, чацвяртак, чатыры, чацвярціна, чацвяртушка, чытырма, учацвярых, чвэрць, чатырыста, чацвёрка, адна чацвёртая; сямнаццаць, сёмы, сямёрка, усемярых, сем, усямёх, сямітысячны, шосты (разрад), першая (прэмія), другая (катэгорыя), трэцяе (месца), першая (група інваліднасці).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ